***У. Е. СНАПКОЎСКІ***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт; пр. Незалежнасці, 4,
220030, Мінск, Беларусь; ulsnap44@inbox.ru*

# АБ РОЛІ І ЗНАЧЭННІ ЎНУТРАНЫХ І ЗНЕШНІХ ФАКТАРАЎ У ГІСТОРЫІ ЗНЕШНЯЙ ПАЛІТЫКІ БЕЛАРУСІ

*Разглядаюцца роля і значэнне ўнутраных і знешніх фактараў у гісторыі знешняй палітыкі Беларусі, пачынаючы з першых гістарычных форм беларускай дзяржаўнасці і заканчваючы яе апошняй нацыянальнай формай – Рэспублікай Беларусь. Адзначаецца важнае значэнне вонкавага асяроддзя для ўзнікнення, развіцця і заняпаду беларускіх дзяржаў, што было абумоўлена перш за ўсё іх геапалітычнай пазіцыяй на мяжы дзвюх культур і цывілізацый – заходняй і ўсходнеславянскай. Робіцца выснова аб тым, што шэраг асаблівасцей гістарычнага развіцця розных форм беларускай дзяржаўнасці (размяшчэнне паміж Усходам і Захадам; этнічная, канфесіянальная, моўная падзеленасць беларускага народа і эліт; іх уразлівасць і падатнасць да знешніх уплываў і інш.) прадвызначылі пэўную слабасць унутранага фактару развіцця Беларусі перад знешнім.*

***Ключавыя словы:*** *гісторыя беларускай дзяржаўнасці; знешнепалітычная гісторыя Беларусі; унутраныя і знешнія фактары развіцця беларускіх дзяржаў; геапалітычнае становішча Беларусі.*

***U. SNAPKOUSKI***

*Belarusian State University; Nezavisimosti ave., 4,
220030, Minsk, Belarus; ulsnap44@inbox.ru*

# ON THE ROLE AND IMPORTANCE OF INTERNAL AND EXTERNAL FACTORS IN THE HISTORY OF BELARUS' FOREIGN POLICY

*The article discusses the role and importance of internal and external factors in the history of Belarus' foreign policy from the early historical forms of the Belarusian statehood to its last national form – Republic of Belarus. The importance of the environment for the emergence, development and decline of the Belarusian states, which was primarily due to their geopolitical position at the interface of two cultures and civilizations - Western and Eastern Slavic are notes. The conclusion is that a number of features of the historical development of different forms of the Belarusian Statehood (location between East and West, ethnic, religious, linguistic separation of the Belarusian*

*people and the its elites, their vulnerability and intractability to external influences, and others) predestined to a certain weakness of the internal factors of development of Belarus before the external ones.*

***Keywords:*** *history of the Belarusian statehood; foreign policy history of Belarus; the internal and external factors of development of the Belarusian states; the geopolitical situation of Belarus.*

Гісторыя знешняй палітыкі – важная, неад'емная частка гісторыі беларускай дзяржаўнасці і ўсёй гісторыі Беларусі. У адпаведнасці са сваім аб'ектам і прадметам яна накіравана на даследаванне і вывучэнне знешніх праяў (кірункаў, форм, сродкаў і метадаў) дзяржаўнай палітыкі беларускіх дзяржаў. У гэтым сэнсе знешняя палітыка мае сваім антыподам унутраную палітыку, якая ахоплівае значна шырэйшае кола прадметна-аб'ектных адносін (эканамічная, сацыяльная, культурная і іншыя віды палітыкі). Дзяржаўная палітыка ўяўляе сабой сукупнасць унутранай і знешняй палітыкі, пры гэтым, як правіла, унутраная палітыка мае прыярытэт над знешняй, што абумоўлена многімі прычынамі, перш за ўсё згаданым вышэй шырэйшым колам прадметна-аб'ектных адносін. У пэўныя гістарычныя моманты, асабліва ў час войнаў ці сур'ёзных міждзяржаўных канфліктаў, знешняя палітыка можа адыгрываць дамінуючую ролю ў дзяржаўнай палітыцы, аднак у больш працяглыя перыяды ўнутраная палітыка вяртае сабе прыярытэт над знешняй.

У гісторыі розных дзяржаў суадносіны паміж унутранай і знешняй палітыкай не былі аднолькавымі і прапарцыянальнымі. Некаторыя буйныя і моцныя дзяржавы, як, напрыклад, ЗША ў XIX – пачатку XX ст. ці імператарскі Кітай, з'яўляліся самадастатковымі ў сілу геапалітычнага становішча і маглі ўпэўнена развівацца без актыўнай знешняй палітыкі, праводзячы палітыку ізаляцыянізму ці самаізаляцыі ад знешняга свету. Праўда, XX ст., асабліва яго другая палова з моцнай тэндэнцыяй да глабалізацыі і ўзаемазалежнасці, зрабіла правядзенне такой палітыкі немагчымым. Прыклад сучасных сярэдніх еўрапейскіх дзяржаў, блізкіх па памерах да Рэспублікі Беларусь, паказвае важную ролю знешняй, у тым ліку знешнеэканамічнай, палітыкі ў іх развіцці. У Бельгіі і Нідэрландах доля знешняга гандлю ў нацыянальным валавым прадукце складае больш за 60 %, і гэта моцна ўплывае на іх унутраную і знешнюю палітыку.

Аб ролі і значэнні ўнутраных і знешніх фактараў у гісторыі Беларусі несумненна задумваліся і дзяліліся сваімі канцэптуальнымі назіраннямі ў абагульняючых працах, выдадзеных ці напісаных ў пачатку XX ст., стваральнікі нацыянальнай гістарычнай школы

(У. Ігнатоўскі, М. Доўнар-Запольскі, В. Ластоўскі, У. Пічэта, А. Цвікевіч і інш.). Найбольш выразна свае погляды і падыходы па гэтых тэарэтычных пытаннях, якія тычыліся перыядызацыі айчыннай гісторыі і ролі Расіі ў часы сярэднявяковай і новай гісторыі Беларусі, выклаў У. Ігнатоўскі.

У прадмове да трэцяга выдання сваёй кнігі «Кароткі нарыс гісторыі Беларусі» (1921 г.) У. Ігнатоўскі акрэсліў сваё метадалагічнае крэда адносна вывучэння Расіі і Беларусі як буйной і малой па памерах краін. Гаворачы аб ігнараванні ў самадзяржаўнай Расіі ўсяго таго, «што насіла на сабе адзнакі мясцовага ці нацыянальнага характару», гісторык развіваў сваю думку наступным чынам: «Усё вялікае, агульнае ставілася замест дробнага, мясцовага і нацыянальнага. Панавала ідэя імперыялізму. З афіцыйнага боку існавала палітычна і культурна толькі адзіная і непадзельная Расія, якая ведала і падтрымлівала адзіную і непадзельную гісторыю, агульнарускую гісторыю царска-панскага кірунку». Задачу беларускіх гісторыкаў ён бачыў у тым, каб «з гары спусьціцца ўніз, каб тут, унізе, а не з вышыні птушынага лёту, рабіць нашу працу», «каб працаваць над тым, што здаецца нам невялікім і дробным» [2, с. 21]. Такім чынам, адзін з заснавальнікаў беларускай гістарычнай школы падкрэсліў важнасць і неабходнасць даследавання гісторыі такіх невялікіх ці сярэдніх па еўрапейскіх памерах краін, як Беларусь. Як вядома аднак, гэты прынцып не мог быць рэалізаваны ў савецкі час, калі гісторыя Беларусі (гісторыя БССР) лічылася неад'емнай часткай гісторыі Расіі (гісторыі СССР), а яе вывучэнне і даследаванне не мела самастойнага пазнавальнага і навуковага значэння.

Для першых гістарычных форм беларускай дзяржаўнасці (зямельканстваў і ВКЛ) вонкавае асяроддзе мела важнае значэнне, што было абумоўлена перш за ўсё іх геапалітычнай пазіцыяй на мяжы дзвюх культур і цывілізацый – заходняй і ўсходнеславянскай. Узнікненне і развіццё старажытнабеларускіх княстваў, галоўным сярод якіх было Полацкае княства, а потым – ВКЛ, адбывалася ў выніку складанага ўзаемадзеяння ўнутраных і знешніх фактараў, што дэманстравала іх супярэчлівае перапляценне і ўзаемаўплывы, а роля ўнутранай і знешняй палітыкі на розных гістарычных этапах мянялася. Гэта асабліва добра бачна на прыкладзе Вялікага Княства Літоўскага, якое ў перыяд станаўлення і росквіту (XIV–XV ст.) праводзіла актыўную, наступальную знешнюю палітыку, а вонкавае асяроддзе пасля разгрому Тэўтонскага ордэна пад Грунвальдам не ўяўляла для гэтай дзяржавы нейкай істотнай небяспекі. Становішча змянілася ў XVI ст., калі пагроза

з усходу ў выглядзе Маскоўскай дзяржавы стала сур'ёзным выклікам для існавання беларуска-літоўскай дзяржавы. Каб зменшыць яе, кіруючыя колы ВКЛ уступілі ў федэратыўны саюз з Польшчай, што было для іх меншым злом у параўнанні з рэальнай перспектывай пройгрышу ў Лівонскай вайне.

Ключавой падзеяй у гісторыі Беларусі, Літвы, Польшчы і Украіны была Люблінская унія 1569 г., 450-годдзе якой было ўрачыста адзначана ў 2019 г. Аб'яднанне ВКЛ і Польшчы ў федэратыўную дзяржаву Рэч Паспалітую застаецца прадметам гістарыяграфічных спрэчак і дыскусій. У беларускай гістарыяграфіі, як пачатку ХХ ст., так і савецкіх часоў, Люблінская унія трактавалася пераважна як адмоўная падзея, якая прывяла да заняпаду ВКЛ, паланізацыі і акаталічвання шляхты. У сучаснай гістарыяграфіі стварэнне Рэчы Паспалітай ацэньваецца больш збалансавана з улікам яе значных гістарычных дасягненняў. Яны асабліва добра бачны з пазіцый знешняй палітыкі і міжнароднага становішча ВКЛ, паколькі заключэнне Люблінскай уніі дазволіла аб'яднаныя сілам Княства і Кароны выграць Лівонскую вайну [4, с. 364–369]. Пазнейшай платай за перамогу стала дээтнізацыя літвінскай шляхты і грамадства. Аднак альтэрнатыва была яшчэ горшай – ужо ў XVI ст. ВКЛ магло быць далучана да Рускай дзяржавы Івана Жахлівага.

У беларускай гістарыяграфіі негатыўныя вынікі і наступствы Люблінскай уніі звязваюцца, як правіла, з польскай феадальнай і каталіцкай экспансіяй і ў пэўнай меры з унутранай палітыкай кіруючых колаў ВКЛ і вялікіх князёў літоўскіх [1, с. 27–28]. Такія падыходы і ацэнкі былі закладзены ў працах згаданых вышэй пачынальнікаў нацыянальнай гістарыяграфіі, якія, у сваю чаргу, адчувалі ўплыў заходнерускай гістарычнай школы XIX – пачатку ХХ ст. (М. Любаўскага, А. Праснякова, І. Лапы і інш.).

Найбольш востра Люблінскую унію і створаную на яе падставе Рэч Паспалітую крытыкаваў У. Ігнатоўскі. Ён пісаў, што Беларусь была інкарпаравана ў дзяржаўны арганізм Рэчы Паспалітай, аб чым, на яго думку, сведчыла назва новай дзяржавы «Польская Рэч Паспалітая» [2, с. 135], што ўяўляецца нам пэўнай нацяжкай (сцвярджэнне аб інкарпарацыі). Гісторык памылкова лічыў Рэч Паспалітую адзінай, непадзельнай (фактычна ўнітарнай) дзяржавай, на што звярнуў увагу сучасны беларускі гісторык А. Грыцкевіч у прадмове да 5-га выдання «Кароткага нарыса» [2, с. 14]. На самай справе гэта была федэрацыя дзвюх дзяржаў з адным каралём (ён жа вялікі князь літоўскі), адным

парламентам – соймам, адзінай знешняй і ваеннай палітыкай, што ў значнай ступені нагадвала канфедэрацыю. Пры гэтым ВКЛ і Польшча захавалі асобную дзяржаўную адміністрацыю, войска, фінансы, законы, мытную справу, дзяржаўныя мовы (лацінскую і старабеларускую).

У. Ігнатоўскі, развіваючы сваю думку аб доўгатэрміновых і пераважна шкодных уплывах Польшчы на «Літоўска-Беларускае гаспадарства», што ішлі ад часоў Крэўскай уніі, прыходзіць да наступнай высновы: «Палітычная незалежнасць Літвы і Беларусі на аснове Люблінскага акту была зьнішчана» [2, с. 135]. Але праз некалькі сказаў гісторык супярэчыць самому сабе, сцвярджаючы, што незалежнасць «Літоўска-Беларускага гаспадарства» фактычна яшчэ доўга існуе, што выяўляецца і ў юрыдычных актах, маючы на ўвазе Статут ВКЛ 1588 г. Паводле яго слоў, самастойнасць Літвы і Беларусі (ВКЛ) асабліва праяўлялася падчас бескаралеўяў і зносін з чужаземнымі гаспадарамі. У іншым месцы Ігнатоўскі піша пра «абмежаванне палітычнай незалежнасці» ВКЛ у выніку падпісання Люблінскай уніі [2, с. 135–136], што таксама азначае карэкціроўку ўласнага катэгарычнага сцвярджэння пра знішчэнне палітычнай незалежнасці Вялікага Княства Літоўскага.

З абвяшчэннем незалежнасці Беларусі гістарычная навука стала важнай часткай гістарычнай палітыкі, з дапамогай якой улады шукалі ўмацавання сваёй легітымнасці [10, с. 400–423]. Прэзідэнт Беларусі А. Лукашэнка ў лекцыі «Гістарычны выбар Рэспублікі Беларусь» перад студэнтамі і выкладчыкамі БДУ 14 сакавіка 2003 г. выступіў супраць ідэалізацыі ВКЛ, у гістарычным развіцці якога, на яго думку, пераважалі негатыўныя тэндэнцыі, звязаныя з прыцясненнем праваслаўнага насельніцтва і горшымі ўмовамі жыцця для беларусаў. Ацэньваючы Люблінскую унію, ён спаслаўся на словы У. Ігнатоўскага, які казаў, што апошняя «шырока адчыніла браму для польскага ўплыву». Сам А. Лукашэнка назваў гэты дакумент «юрыдычным афармленнем паглынання Польшчай Літоўскага княства» [11].

Паводле слоў прэзідэнта, негатыўныя ўрокі гісторыі для беларусаў у час знаходжання ВКЛ у складзе Рэчы Паспалітай заключаліся ў наступных падзеях: 1) Брэсцкая царкоўная ўнія 1596 г., накіраваная на нейтралізацыю ўплыву праваслаўнай рэлігіі; 2) забарона польскімі ўладамі ў 1696 г. выкарыстання старабеларускай мовы ў службовым справаводстве ВКЛ; 3) войны ВКЛ, а потым Рэчы Паспалітай з Маскоўскай дзяржавай (Расіяй), якія часам ператвараліся ў прадмет сучасных палітычных спекуляцый. З іншага боку, А. Лукашэнка пазітыўна расцаніў уключэнне ўсходнеславянскіх зямель

у склад Расійскай імперыі, што адбылося ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай: «Включение восточнославянских земель в состав Российской империи тогда имело для белорусского этноса спасительный характер. Прогрессивное значение заключалось в том, что была ликвидирована шляхетская анархия, кровавые разборки между шляхтой, от которых страдал в первую очередь простой народ» [11].

Выказаныя ацэнкі і падыходы былі абумоўлены новай гістарыяграфічнай канцэпцыяй і новай гістарычнай палітыкай, якія сталі праводзіцца ў жыццё з сярэдзіны 1990-х гг. [8, с. 3–7]. Аднак і яны не заставаліся нязменнымі, адчуваючы ўплывы навакольнага асяроддзя (гістарычнай палітыкі Расіі, Польшчы і Літвы) і нацыянальнай плыні ў асяроддзі беларускіх гісторыкаў. Узважаная, кампрамісная ацэнка Люблінскай уніі і існаванню Рэчы Паспалітай як федэратыўнай польска-літвінскай дзяржавы даецца ў абагульняючых працах па гісторыі Беларусі: шасцітомнай «Гісторыі Беларусі» і пяцітомнай «Гісторыі беларускай дзяржаўнасці».

Падзелы Рэчы Паспалітай і далучэнне беларускіх зямель да Расійскай імперыі засведчылі перавагу знешняга фактару (трох дзяржаўзаборцаў) над унутраным (іманентнай слабасцю польска-літвінскай дзяржавы). Развіццё беларускіх тэрыторый (губерняў) у складзе Расійскай дзяржавы, якую сучасная беларуская гістарыяграфія ў выглядзе «Гісторыі беларускай дзяржаўнасці» залічвае да адной з гістарычных форм беларускай дзяржаўнасці [5, с. 3–4], таксама дэманструе супярэчлівае ўзаемадзеянне ўнутраных і знешніх фактараў. З аднаго боку, ішлі аб'ектыўныя працэсы фармавання беларускай нацыі і нацыянальнага руху з яго стратэгічнай мэтай аўтаноміі для Беларусі ў складзе Расійскай федэратыўнай дэмакратычнай дзяржавы. Гэта супярэчыла асновам расійскага дзяржаўнага існавання з яго бачаннем беларусаў і ўкраінцаў у складзе адзінага рускага суперэтнасу ці агульнарускага народа [12, с. 165–170 і інш.]. З другога боку, землі былога ВКЛ (беларускія, літоўскія, украінскія) выконвалі ролю стратэгічнага фарпоста Расіі на заходнім кірунку, што праявілася падчас напалеонаўскіх войнаў і Першай сусветнай вайны). Аднак, як аказалася, малодшыя славянскія браты (украінцы і беларусы) не зусім добра выконвалі гэту місію, падтрымліваючы ў масавым парадку Напалеона ці германскага імператара [13, с. 223–225].

Першыя дзве формы нацыянальнай дзяржаўнасці ў XX ст. (БНР і БССР) узніклі дзякуючы перш за ўсё спрыяльнаму збегу міжнародных абставін. Абвяшчэнне БНР стала магчымым у выніку распаду Расійскай імперыі і адыходу бальшавікоў з большай часткі Беларусі;

утварэнне БССР – палітыкі савецкай Расіі. Гэтымі спрыяльнымі абставінамі скарысталіся (іншая справа – наколькі паспяхова) беларускія нацыянальна-патрыятычныя, унутрыпалітычныя сілы: Беларуская сацыялістычная грамада ў выпадку БНР, нацыянал-камуністы ў выпадку БССР. Канстытуіраванне БНР ішло больш натуральным шляхам (ад Усебеларускага з'езда праз тры Устаўныя граматы да абвяшчэння незалежнасці 25 сакавіка 1918 г.) і ўнутраны фактар (нацыянальныя адраджэнцы, прыхільнікі незалежнасці) адыгрываў вырашальную ролю ў абставінах, калі ў Мінску пасля адыходу бальшавікоў узнік вакуум улады. Зусім іншым шляхам ішоў працэс канстытуіравання БССР, узнікненне якой было рэакцыяй РСФСР на абвяшчэнне і дзейнасць БНР, і таму палітыка ленінскага ўрада (знешні фактар) адыграла вырашальную ролю ў стварэнні беларускай савецкай рэспублікі.

Пазней знешні фактар паказаў сваё дамінуючае значэнне ў палітыцы і лёсах БНР (адыход нямецкіх войскаў з тэрыторыі Беларусі, вяртанне бальшавікоў, двaістая палітыка Польшчы, непрызнанне з боку дзяржаў Антанты). Знешні фактар (залежнасць ад савецкай Расіі) дыктаваў унутраную і знешнюю палітыку БССР і прывёў рэспубліку ў склад СССР. Зразумела, што апісаная вышэй схема ўзаемадзеяння і ўзаемаўплыву ўнутраных і знешніх фактараў у працэсах нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва на тэрыторыі Беларусі ў 1917–1922 гг. вельмі спрошчаная і не можа адлюстраваць усяго багацця вектараў дзейнасці ўнутраных і знешніх сіл, накіраванай унутр Беларусі ці наадварот па-за яе межы і пры гэтым цесна пераплеценай паміж сабой. Са значна большай паўнатой і глыбінёй адлюстравання дынамікі развіцця ўнутраных і знешніх падзей гэтыя працэсы апісаны ў трэцім томе «Гісторыі беларускай дзяржаўнасці» [6, с. 3–5, 611–613].

Палітыка савецкай Расіі ў «беларускім пытанні» з'яўлялася самым важным, галоўным і вырашальным знешнепалітычным фактарам, які прадвызначаў дзяржаваўтваральныя працэсы на тэрыторыі Беларусі. Такі падыход набірае ўсё большую моц у працах беларускіх і замежных гісторыкаў, прысвечаных стварэнню БССР. У прыватнасці, у пятым томе шасцітомнай «Гісторыі Беларусі» I. Ігнаценка і С. Хоміч небеспадставна сцвярджаюць, што велізарны ўплыў на выніку працэсу аднаўлення нацыянальнай дзяржаўнасці ў форме БССР аказалі знешнепалітычны фактар і інтарэсы бальшавіцкай рэвалюцыі ў Расіі [3, с. 112]. Іншага пункту погляду прытрымліваецца У. Ладысеў, які лічыць стварэнне беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове (ці беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці) вынікам

узаемадзеяння аб’ектыўных і суб’ектыўных фактараў, лагічнага развіцця нацыянальнага руху ў Паўночна-Заходнім краі Расійскай імперыі і ажыццяўлення палітыкі бальшавікоў у нацыянальным пытанні [9, с. 165]. Ён акцэнтуе такім чынам увагу на ўнутраных (аб’ектыўных і суб’ектыўных) фактарах развіцця беларускага нацыянальнага руху, які ўвасобіўся ў абвяшчэнні БССР.

Развіццё беларускага этнасу і фармаванне беларускай нацыі ў Расійскай імперыі і Савецкім Саюзе ішло марудна і супярэчліва, а станаўленне ідэнтычнасці хісталася паміж рускасцю/савецкасцю і беларускасцю. Гэты ўнутраны фактар, цесна звязаны са знешнім (культурна-цывілізацыйнай раз’яднанасцю беларусаў), што выражалася ў дыхатаміі «паміж Усходам і Захадам», вельмі моцна ўплываў і працягвае ўплываць на ўнутры- і знешнепалітычную гісторыю Беларусі XIX – пачатку XXI ст. [12, с. 130–139, 149–151]. Нацыянальныя формы беларускай дзяржаўнасці (БНР, БССР і Рэспубліка Беларусь), што існавалі і працягваюць жыццё на мяжы дзвюх вялікіх цывілізацый (усходнеславянскай і заходняй), не здолелі вытрымаць баланс раўнавагі паміж Усходам і Захадам. Да гэтага беспаспяхова імкнулася БНР, а што датычылася БССР і Рэспублікі Беларусь, то яны засталіся ў савецкай (БССР) і пераважна расійскай (незалежная Беларусь) сферах уплыву [13, с. 427–430].

Вырашальнае значэнне знешняга фактару, пад якім разумеюцца сумесныя дзеянні Германіі і СССР супраць Польшчы ў верасні 1939 г., праявілася ў працэсе ўз’яднання Заходняй Беларусі з БССР. Уз’яднанне Заходняй і Усходняй Беларусі з’яўляецца адной з галоўных падзей гісторыі Беларусі XX ст. і стаіць на адной ступені разам з такімі эпахальнымі датамі, як абвяшчэнне незалежнасці БНР і БССР, перамога народаў СССР над фашызмам, распад СССР і набыццё незалежнасці Рэспублікай Беларусь. Усе гэтыя чатыры гістарычныя падзеі адбыліся ў выніку дыялектычнага перапляцення і ўзаемадзеяння ўнутраных і знешніх фактараў, якія разгортваліся ў дачыненні да Беларусі як да тэрыторыі былой Расійскай імперыі, потым нацыяльна-палітычнай адзінкі, што імкнулася да аўтаноміі ці нават незалежнасці (БНР і БССР), нарэшце саюзнай рэспублікі ў складзе СССР. Слабасць (адносная ці відавочная) унутраных фактараў абумоўлівала і адначасова тлумачыла занадта моцнае ўздзеянне знешніх сіл на дзяржаваўтваральныя працэсы, унутранае і міжнароднае становішча суб’ектаў (патэнцыяльных ці рэальных) нацыянальнай дзяржаўнасці (БНР, БССР, Заходняй Беларусі).

Вяртаючыся да значэння знешняга фактару ва ўз'яднанні Заходняй Беларусі з БССР (яе далучэнні да СССР), падкрэслім, што ў тагачасных геапалітычных умовах гэта дазволіла аб'яднаць дзве часткі беларускай нацыі, што мела несумненна прагрэсіўнае значэнне для кансалідацыі беларускага этнасу. У дадзеным выпадку можна і трэба казаць пра станоўчы ўплыў такой знешняй сілы, як сталінская знешняя палітыка, на развіццё сітуацыі ў Беларусі (Заходняй і Усходняй) і вакол яе. Гэта асабліва падкрэсліваецца ў чацвёртым томе «Гісторыі беларускай дзяржаўнасці» [7, с. 3, 58–68, 99] і афіцыйным артыкуле пра гістарычную палітыку сучаснай беларускай дзяржавы [8, с. 9]. Разам з тым нельга забываць і пра негатыўныя наступствы ўз'яднання 1939 г.: перадачу Віленскага краю Літве, што было платай беларусаў за аб'яднанне. Падзяліўшы Польшчу, СССР і Германія ўступілі ў непасрэдны кантакт, атрымаўшы тысячакіламетровую сумесную граніцу, пра што даўно марыў нацысцкі фюрэр. Сталін тым самым здейсніў стратэгічную памылку, не здаўшы экзамен на элементарнае веданне геапалітыкі.

Мегатрэнд гісторыі беларускай дзяржаўнасці і яе знешняй палітыкі ў XIX – пачатку XXI ст. вызначаецца вырашальным уплывам усходняга, знешняга фактару: Расійскай імперыі, Савецкага Саюза, Расійскай Федэрацыі. Фармальна незалежная Беларусь існуе ў розных формах і ступені залежнасці ад вялікай усходняй суседкі (інстытуцыянальнай – праз праект саюзнай дзяржавы, палітычнай, ваеннай, эканамічнай, культурнай). У сваю чаргу, і Расія залежыць ад Беларусі (у ваенна-стратэгічнай сферы, транзітных шляхах, гандлёвым абароце), аднак ступень гэтай залежнасці значна меншая, за выключэннем геастратэгіі.

Тысячагадовая традыцыя беларускай дзяржаўнасці, якая выражаецца ў яе гістарычных і нацыянальных формах, паказвае выключна важнае значэнне для іх развіцця знешняга асяроддзя, якое, як мы бачылі, было то спрыяльным, то неспрыяльным. Яно магло садзейнічаць фармаванню і існаванню дзяржавы, а магло ўяўляць для яе развіцця істотную небяспеку. Шэраг асаблівасцей гістарычнага развіцця беларускіх дзяржаў (размяшчэнне на мяжы культур і цывілізацый, этнічная, канфесіянальная, моўная падзеленасць насельніцтва і эліт, іх уразлівасць і падатнасць да знешніх уплываў, што ўздейнічала на фармаванне адпаведных рыс менталітэту і нацыянальнага характару беларусаў і інш.) прадвызначылі пэў-

ную слабасць унутранага фактару развіцця Беларусі перад знешнім. Галоўны гістарычны ўрок, які павінны вынесці беларусы з багатай, слаўнай, нялёгкай і драматычнай знешнепалітычнай гісторыі сваёй краіны, заключаецца ў тым, каб мацаваць яе ўнутранае адзінства і кансалідаванасць.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. *Галенчанка Г.* Гістарыяграфія // Гісторыя Беларусі : у 6 т. ; рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. Минск : Экаперспектыва, 2008. Т. 2: Беларусь у перыяд Вялікага Княства Літоўскага / Ю. Бохан [і інш.]. С. 11–38.

2. *Ігнатоўскі У. М.* Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. 5-е выд. Минск : Беларусь, 1991.

3. *Ігнаценка І., Хоміч С.* Утварэнне БССР // Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : Экаперспектыва, 2006. Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг. С. 105–112.

4. История белорусской государственности : в 5 т. Минск : Беларус. навука, 2018. Т. 1: Белорусская государственность: от истоков до конца XVIII в. / А. А. Коваленя [и др.] ; отв. ред.: О. Н. Левко, В. Ф. Голубев.

5. История белорусской государственности : в 5 т. Минск : Беларус. навука, 2019. Т. 2: Белорусская государственность в период Российской империи (конец XVIII – начало XX в) / Н. В. Смехович [и др.] ; отв. ред.: Н. В. Смехович, А. В. Унучек, Е. Н. Филатова.

6. История белорусской государственности : в 5 т. Минск : Беларус. навука, 2019. Т. 3: Белорусская государственность: от идеи к национальному государству (1917–1939 гг.) / А. А. Коваленя [и др.] ; отв. ред.: В. Г. Мазец, Н. В. Смехович, С. А. Третьяк.

7. История белорусской государственности : в 5 т. Минск : Беларус. навука, 2019. Т. 4: Белорусская государственность накануне и в период Великой Отечественной войны и послевоенного восстановления (1939–1953 гг.) / А. А. Коваленя [и др.] ; отв. ред. Н. Б. Нестерович.

8. К вопросу об исторической политике / А. Коваленя [и др.] // Беларус. думка. 2019. № 8. С. 3–11.

9. *Ладысеў У. Ф.* Пазіцыя кіраўніцтва Савецкай Расіі ў беларускім пытанні. Утварэнне ССРБ // Нарыс гісторыі беларускай дзяржаўнасці: XX стагоддзе / М. П. Касцюк [і інш.] ; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. Мінск : Беларус. навука, 2008. С. 138–165.

10. *Ліндндэр Р.* Гісторыя і ўлада: нацыятворчы працэс і гістарычная палітыка ў Беларусі XIX–XX ст. СПб., Неўскі прасцяг, 2003.

11. *Лукашенко А. Г.* Лекция «Исторический выбор Республики Беларусь» в БГУ 14 марта 2003 года [Электронный ресурс]. URL: http://president.gov.by/ru/news_ru/view/lektsija-istoricheskij-vybor-respubliki-belarus-v-bgu-5819/ (дата обращения: 15.02.2019).

12. *Радзік Р.* Вакол ідэнтычнасці беларусаў. Мінск : Лімарыус, 2017.

13. *Снапковский В. Е.* История внешней политики Беларуси : пособие. Минск : БГУ, 2013.